БРЫЛЁЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 26 (108)
верасень
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.



"Служы, брат!.."

с.6

Фота Надзеі Паскакухінай

КАМУНІКАТ



Існасць

с.3

Свята

с.4-5

Памяць

с.8

З Юбілеем!

30 верасня
Ядвіга
Станіславаўна
ДЗЯТЛАВА
адзначае 75-годдзе

15 верасня
Марыя
Емельянаўна
КАПЫЛОВА
адзначае 55-годдзе

24 верасня
Любоў
Міхайлаўна
ЦЫМЛЯКОВА
адзначае 50-годдзе

4 верасня
Марына
Васільеўна
МАКАЕВА
(Сцепчанкава)
адзначае 30-годдзе

8 верасня
Таццяна
Мікалаеўна
ЖУКАВА
адзначае 25-годдзе

8 верасня
Кацярына
Мікалаеўна
ЖУКАВА
адзначае 25-годдзе

9 верасня
Уладзімір
Мікалаевіч
ПАСКАКУХІН
адзначае
20-годдзе

З Днём нараджэння!

У верасні нарадзіліся:

1 - Галіна Ягораўна Рамашкевіч
2 - Міхаіл Мікалаевіч Коўзан
3 - Надзея Васільеўна Казакова
4 - Генадзь Васільевіч Яўсееў
11 - Ніна Анатольеўна Гулакова
22 - Уладзімір Мікалаевіч Раманаў
23 - Наталля Генадзьеўна Смалякова
26 - Андрэй Анатольевіч Васюрэнка
29 - Генадзь Васільевіч Пшанічны
29 - Вераніка Міхайлаўна Куляшова

Рэлігійныя святы ў верасні

11 сентября - Усекновение главы Пророка, Предтечи и Крестителя Господня Иоанна

Как повествует Евангелие, Иоанн Креститель был арестован за обличительные речи против правителя Галилеи Ирода Антипы и обезглавлен по наущению Иродиады, жены Ирода. Пророк Божий открыто обличал Ирода за то, что оставив законную жену, он беззаконно сожительствовал с Иродиадой, женой своего брата Филиппа.

Святое тело Иоанна Крестителя в ту же ночь его ученики погребли в самарийском городе Севастии, там, где совершилось злодеяние.

В 362 году по приказу императора Юлиана Отступника язычники вскрыли могилу Иоанна Крестителя и сожгли его останки, однако христианам удалось приобрести часть этих останков и переправить их в Александрию, где они хранятся и по сей день как величайшая святыня.

Отмечать день мученической кончины Иоанна Крестителя начали его ученики.

Рождество Пресвятой Владычицы нашей Богородицы и Приснодевы Марии

Католики - 8 сентября
Православные - 21 сентября

Праздник установлен Церковью в IV веке, обстоятельства этого события сохранило нам Предание. .

В небольшом галилейском городе Назарете жила престарелая супружеская пара — Иоаким и Анна. Оба супруга были праведны и благочестивы. Святые супруги Иоаким и Анна долгое время были бездетны и плакали о том, что у них нет детей. Однажды Иоаким в большой праздник принес в Иерусалимский храм дары Господу Богу. Но священник не захотел принять даров Иоакима, потому что он был бездетен, а дети считались благословением Божиим.

Тем временем жена его, бывшая дома, тоже услышала, что первосвященник в храме отказался принять их дары из-за бездетности. Она узнала также, что муж ее, скорбя и плача, ушел в пустыню, и сама заплакала. Анна пошла в свой сад, села под лавровым деревом, вздохнула и, взглянув на небо полными слез глазами, заметила вверху, на дереве, гнездо, в котором пищали маленькие птенцы. *«Даже птицы имеют детей, а у нас нет такого утешения в старости»,* — подумала Анна.

Внезапно ей явился ангел Господень. Он сказал: *«Ты зачнешь и родишь Дочь, благословенную, превыше всех. Через Неё получат благословение Божие и все земные народы. Через Неё будет дано всем людям Спасение. Имя Ей будет Мария».*

В то же самое время ангел явился в пустыне и Иоакиму. Он сказал: *«Иоаким! Бог услышал твою молитву, и Он благоволит даровать тебе Свою благодать. Твоя жена Анна зачнет и родит тебе Дочь, которая будет радостью для всего мира. Вот тебе знак, что я говорю тебе правду: иди к храму в Иерусалим, и там, у Золотых ворот, найдешь свою супругу Анну, которой я сказал то же самое».*

Удивлённый Иоаким, благодаря всем сердцем Бога, с радостью поспешно отправился в Иерусалим, к храму. Там, как сказал ему ангел, он увидел Анну, молящуюся Богу у Золотых ворот, и рассказал ей об ангеле. Она также рассказала мужу обо всем, что видела и слышала о рождении Дочери. Помолившись Господу и поклонившись Ему в храме, супруги вернулись домой.

Через девять месяцев у Анны родилась Дочь, чистейшая и благословеннейшая. Выше всего, что было когда-нибудь создано, начало нашего спасения, наша заступница пред Богом. О рождестве Её радовались небо и земля. По случаю Её рождения Иоаким принес Богу большие дары и жертвы, получил благословение первосвященника, священников и всех людей за то, что удостоился благословения Божия. Потом он устроил в своём доме большой пир, и все веселились и славили Бога.

Святая Церковь справедливо называет Иоакима и Анну Богоотцами, потому что от Пресвятой их Дочери девы Марии родился Иисус Христос.



Воздвижение Животворящего Креста Господня

Католики - 14 сентября
Православные - 27 сентября

Это знаменательное событие произошло при императоре Константине Великом, который первым из римских императоров прекратил гонения на христиан.

Равноапостольный император Константин, горячо желая отыскать Крест, на котором был распят Иисус Христос, направил в Иерусалим свою мать, благочестивую царицу Елену. Хотя святая царица Елена к этому времени была уже в преклонных годах, она с воодушевлением взялась за исполнение поручения.

Разыскивая Животворящий Крест, царица Елена расспрашивала христиан и иудеев, но долгое время ее поиски оставались безуспешными. Наконец, ей указали на одного старого еврея по имени Иуда, который сообщил, что Крест зарыт там, где стоит капище Венеры. Капище разрушили и, совершив молитву, начали копать землю. Вскоре были обнаружены Гроб Господень и неподалеку от него три креста, дощечка с надписью «Иисус Назорей, Царь Иудейский», сделанная по приказанию Пилата, и четыре гвоздя, пронзившие Тело Господа.

Чтобы узнать, на котором из трех крестов был распят Спаситель, Патриарх Макарий поочередно стал подносить кресты один за другим к тяжелобольной женщине. От двух крестов не произошло никакого чуда; когда же возложили третий крест, то она тот час исцелилась. Случилось, что в это время несли тело для погребения. Тогда стали возлагать кресты на умершего; и когда возложили третий крест, покойный ожил. Увидев воскресшего, все убедились, что найден Животворящий Крест. Христиане просили святителя Макария поднять, воздвигнуть Крест. Тогда Патриарх и другие духовные лица начали высоко поднимать Святой Крест, а народ, взывая: *«Господи, помилуй»*, поклонялся Честному Древу.

В Константинополь святая Елена привезла с собой часть Животворящего Древа и гвозди. Император Константин повелел воздвигнуть в Иерусалиме величественный храм в честь Воскресения Христова, включавший в себя и Гроб Господень, и Голгофу. Храм строился около 10 лет и был освящен 13 сентября 335 года. На следующий день, 14 сентября, установлено было праздновать Воздвижения Честного и Животворящего Креста.

... І зноў званок заве на ўрок

Як заўсёды, 1 верасня -- святочны дзень для усіх вучняў. Дзверы Брылеўскай школы расчыніліся пасля летніх канікулаў, і звонкія дзіцячыя галасы аздобілі утульныя школьныя класы. На ўрачыстасць разам з вучнямі прыйшлі іх бацькі, а таксама прадстаўнікі ўлады і фірмы “Днепр”.

У сваім уступным слове дырэктар школы Наталля Анатольеўна Ярмаш павіншавала вучняў з пачаткам новага навучальнага года і пажадала ім поспехаў у вучобе.

Старшыня выканкама Брылеўскага сельскага Савета дэпутатаў Уладзімір Ільіч Мажораў выказаў упэўненасць у тым, што маладыя брылеўцы будуць самааддана асвойваць складаныя вышыні Краіны Ведаў.

Намеснік дырэктара ААТ “Кадзіна” Канстанцін Аляксандравіч Жыгуцкі падзякваў вучням за тую дапамогу, якія яны заўсёды аказваюць фірме, і перадаў школе каштоўны падарунак -- DVD-прайгравальнік.

Ад імя бацькоў цёпла і пранікнёна выказалася Алена Іванаўна Мухортава.

А потым зашумела-зайграла святочная праграма, падрыхтаваная вучнямі пад кіраўніцтвам настаўніцы Вольгі Аляксандраўны Вараб’ёвай. Тут былі і вядомы ўсім Нязнайка, і Бураціна з залатым ключыкам, які ўрэшце рэшт гучаннем старога школьнага званка абвясціў аб пачатку заняткаў.

І тэма першага ўрока “Зямля бацькоў -- мая зямля” сонечна паклалася на твары ўсхваляваных школьнікаў.

У добры час!

Вольга МАЙБУРАВА.
Фотаздымкі М.Яцкова.

А.Пухоўскі, Ц.Баброў, Р.Жукава, К.Пятроў і З.Мяшкоў

Н.А.Ярмаш

У.І.Мажораў

К.А.Жыгуцкі

А.І.Мухортава

З вялікай цікавасцю за сваімі старэйшымі сябрамі назіралі выхаванцы Брылеўскага сада.

В.А.Вараб’ёва

С.М.Чумакова, А.У.Кавалёва і Л.П.Карнеева

Т.М.Васюрэнка

Рэгіна Жукава

Зміцер Мяшкоў

Марына Пухоўская


Яна Пшанічная

“Бураціна” - Аляксей Аляксейкоў.

А.М.Яцкова

К.М.Жукава з сынам Іллёй і В.М.Калынюк з дачкой Міланай.

Т.Ф.Прудзікава расказвае пра беларускую выцінанку.

“Нязнайка” - Яна Какоўка

Першы ўрок новага навучальнага года.

Зміцер Мяшкоў і Цімафей Баброў

"Служы, брат!.."

Для брылеўца Ўладзіміра Мікалаевіча Паскакухіна дзень 8 жніўня быў вельмі хвалюючым -- малады воін прымаў прысягу на вернасць беларускаму народу і Айчыне. Ля будынка ваеннай Акадэміі Рэспублікі Беларусь (менавіта тут наш зямляк праходзіць службу) адбылося ўрачыстае пастраенне, і ўзнёслыя словы Прысягі запляліся ў прыгажосць сонечнага летняга дня. А побач з Уладзімірам у гэта імгненне былі яго родныя -- бацька, маці, сястра і стрыечны брат Цімафей Баброў, якому, дарэчы, усё тут было цікава -- і маршыруючыя салдаты, і братаў аўтамат, і ваенная тэхніка, якую можна было дасканальна даследваць...

Потым быў вольны час, і Уладзімір вырашыў паказаць сваім родным Мінск з 70-мятровай вышыні будынка Нацыянальнай бібліятэкі. Перад брылеўцамі развінулася сталіца. А за ёй і ўся беларуская зямля, якую надзейна абароніць наш Уладзімір.

Да прыняцця Прысягі -- некалькі імгненняў...

З бацькам Мікалаем Мікалаевічам, сястрой Надзеяй, маці Тамарай Іванаўнай і братам Цімафеем.

Цімафею ўсё цікава...

Будынак Нацыянальнай бібліятэкі і мінскія краявіды

Ля помніка Францыску Скарыне.



Браты на агляднай пляцоўцы.

Фотаздымкі Надзеі Паскакухінай.

БРЫЛЁЎСКАЯ БІБЛІЯТЭКА ІНФАРМУЕ

Народная газета
11.09.2009 г.

СІЛА РОДНАЙ ЗЯМЛІ

● Тыя людзі, якія адпраўляліся ў далёкую дарогу або пераязджалі на новае месца жыхарства, бралі з сабой жменю роднай зямлі.

● Зямлю бралі ў далёкую дарогу, і калі здаралася, што чалавек паміраў на чужыне, то яе абавязкова высыпалі яму на магілу.

● Жменьку зямлі зашывалі ў ладанку і насілі як абярэг ад нячыстай сілы і праклёнаў.

● Калі хто-небудзь з мужчын ішоў на вайну, то перад хатай выконваўся наступны рытуал. Чалавек босай нагой пакідаў на зямлі след, маці або жонка збірала гэты адбітак на чысцюткую хусціну, завязвалі на два вузлы і неслі ў хату за бажніцу. Людзі верылі, што з такім чалавекам нічога не здарыцца, таму што яго будзе перасцерагаць чырвоны кут. Калі ж чалавек вяртаўся дадому, зямлю высыпалі на тое ж месца, адкуль яе бралі.

● Збіраючыся ў далёкую дарогу, людзі звярталіся да зямлі з просьбай аб уратаванні: *"Маці-сыра Зямля, спасі мяне, на цябе надзея, спасай нас. Калі ты не спасеш, хто ж нас спасець? Я ж на цябе іду, а ты мяне спасай, укажы мне пуць харошы"*.



● Калі трэба было вырашыць якую-ненебудзь складаную спрэчку і даказаць сваю праўдзівасць, чалавек кляўся зямлёй. Той, хто лічыў, што праўда за ім, браў у рукі ці ў рот зямлю або клаў яе сабе на галаву. Пры гэтым ён ведаў: зман недапушчальны, бо тут жа на вачах прысутных ён пачарнее, як зямля.

● Народныя лекары ведалі, што самым цяжкім быў праклён маці. Ні адзін знахар выгаварыць яго не мог. Каб зняць праклён, сын або дачка павінны былі стаць на калені і з'есці жменьку зямлі або трой-чы пацалаваць зямлю.

Народная газета
20.08.2009 г.

Вядомы кінарэжысёр Карэн ШАХНАЗАРАЎ аб уладзе:

«...Власть меняет человека, и далеко не в лучшую сторону. Я представляю, какое это испытание – быть наверху. Если по-простому – власть портит. Но другого выхода тоже нет. То есть, строго говоря, никто другого не придумал. Всё равно власть нужна – в тех или иных руках. Другое дело, хочется, чтобы люди, которые обладают властью, понимали бы, что это очень большая ответственность. Должен присутствовать здравый смысл у наделённого властью человека. Надо пытаться контролировать себя. Но власть людей меняет, безусловно».

МВ Магілёўскія ведамасці
1.09.2009 г.

"СВЕТ МОЙ, ЗЕРКАЛО..."

Советы от психолога-аналитика Геннадия Лагутина:

Если вы плохо себя чувствуете, не подходите к зеркалу, чтобы оно не впитало в себя негатив, и позже, когда выздоровеете, не вернуло обратно.

● Если в доме было много смертей (2 и более), замените старые зеркала новыми.

● Если в доме побывал нехороший человек, зеркало нужно очистить: промыть холодной водой и поводить возле него свечой, читая при этом молитвы (свечу, кстати, нужно держать на уровне губ, чтобы получился «огненный заряд» и был достигнут наибольший эффект).

● Если зеркало стало мутным и влажная уборка не помогает - унесите его из дома. Такое зеркало уже информационно перенасыщено и не даст положительной энергетики.

● Зеркало может старить человека, особенно это касается женщин, ведь кто как ни они проводят много времени перед зеркалами?! Объяснить это можно так: излученная нами и отраженная от зеркала энергия частично нейтрализует и как бы выедает спереди нашу «защитную ауру». Не проводите возле зеркала более пяти минут.

● Не смотрите в треснутое зеркало – оно забирает вашу энергию.

● Ни в коем случае не вешайте зеркало напротив себя в спальне, оно не должно видеть, как вы спите.

● Ни в коем случае зеркало не должно «смотреть» на окно. Особенно опасно увидеть в нём отражение луны. Ведь луна несёт отрицательную энергетику и, отразившись в зеркале, оставит её там.

● Бережно относитесь к зеркалу: не допускайте ни трещин, ни сколов, постоянно его протирайте. Зеркало должно чувствовать, что его любят. И оно ответит взаимностью.

● Не обижайте зеркало. Если вам нужна разрядка, лучше покричите в подушку, а к зеркалу -- только с хорошим настроением и светлыми мыслями.

● Если вы вышли из дома, но что-то забыли, войдя, обязательно подойдите к зеркалу и просто скажите ему: *«Я за счастьем вернулся»*. Дело в том, что зеркало вас уже проводило и неожиданное возвращение может вызвать у него «испуг». А подойдя к зеркалу, вы его «успокоите». В противном случае удачи не будет.

Прозвішча падпісчыка

Ілля Мяфодзьевіч БУГЛАКОЎ (1931-2009)

6 верасня 2009 года на 79-м годзе жыцця памёр Ілля Мяфодзьевіч Буглакоў.

Ён нарадзіўся 5 студзеня 1931 года ў в. Брылі ў сям'і Мяфодзія Іванавіча і Хрысціны Рыгораўны Буглаковых. З дзяцінства прызвычаіўся да сялянскага жыцця. Адчуў на сваім лёсе чорныя нягоды ваеннага ліхалецця. У пасляваенную пару актыўна ўключыўся ў працоўны рытм калгаса імя Ільіча, аддаючы ўсе свае сілы і намаганні штодзённай карпатлівай працы.

Сустрэўшы на сваім жыццёвым шляху Валянціну Іванаўну Гурскую, аддаў ёй сваё сэрца і збудаваў утульнае і цёплае радзіннае гняздо, адкуль у вялікі свет пайшоў сын Мікалай, а потым два ўнукі і два праўнукі. І тое, што аднаго з праўнукаў назвалі Іллёй, паклалася ўзнёслым і хвалюючым адбіткам на прадзедава сэрца.

Ілля Мяфодзьевіч быў вельмі працалюбівым і бачыў у працы сэнс свайго жыцця і ўсяго існага. Нікому не адмаўляў, калі звярталіся за дапамогай. Жыў па сваіх жыццёвых прынцыпах, дзе ў аснове ляжалі справядлівасць і дабрыня. І заўсёды карыстаўся вялікай павагай аднавяскоўцаў.

Да апошняга свайго дня быў прыкладам нястомнасці і жыццелюбства. І ягоны нечаканы адыход ахінуў чорным сумам усіх, хто яго ведаў...

Бывай, Ілля Мяфодзьевіч!..

АДНАВЯСКОЎЦЫ.

Сустракацца з Іллёй Мяфодзьевічам Буглаковым заўсёды было цікава. Яго гамонка была па-сялянскі канкрэтнай і вобразнай. І калі гэта былі ўспаміны, то падзеі мінулых часоў былі вельмі рэльефнымі -- праз дэталі і непаўторныя інтанацыі.

Напярэдадні 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў зайшла ў нас размова аб тым, як гэтыя падзеі адбываліся ў нашых Брылях. І вось што расказаў Ілля Мяфодзьевіч:

"Было гэта недзе ў чэрвені 1944 года. З усходу грымела ўсё мацней, і ўсё наша Падлессе чакала, калі ж урэшце прыйдуць нашы. І ў адзін дзень я і мой сябрук Мікалай Баранаў убачылі, як на гэты бераг Рудэі пераехаў танк з чырвонай зоркай. Ох, мы і ўзрадаваліся! Пабеглі за ім, і калі машына спынілася, нават пачалі мацаць гусеніцы. Люк адчыніўся, адтуль паказаўся танкіст у шлёме, саскочыў на зямлю, падышоў да нас і запытаўся: "Ну, як вы тут, хлопцы?" Не паспелі мы адказаць, як з боку школы шахнулі кулямётныя чэргі -- і як раз у наш бок. А школа ж стаіць на ўзгорку, і адтуль усё вельмі добра прастрэльвалася. Было чутна, як побач заціўкалі кулі. А той танкіст, загроб нас у ахапку, штурхнуў за танк і крынуў: "Ляжыце пакуль тут і не выторквайцеся!" Ну, нам з Міколам два разы паўтараць не трэба, -- ляжым, хаваемся. Але ж цікава! Танк пачаў выкручваць сваю башню ў бок школы і праз імгненне стрэл з пушкі гахнуў так, што ў вушах заклала. З першага разу не атрымалася папасці, і кулямёт працягваў страляць. Праз пару хвілін бухнуў другі танкавы стрэл, і той паддашкавы нямецкі кулямёт змоўк. Ну, мы і пабеглі да сваіх хат -- пакуль усталявалася зацішша. Так вось і вызвалялі нас ад немцаў... Да-а, былі справы!.."

І. М. Буглакоў дапамагае суседзям ліквідаваць наступствы чэрвеньскага ўрагану.
12.06.2009 г.

Ішла нетаропкая гаворка -- і мне наяве ўбачыліся і той танк, і вясковыя хлапчукі, якім не сядзелася ў сховішчах за хатамі, і школа на ўзгорку, дзе немцы зрабілі ўмацаваную кулямётную кропку. І неяк не па сабе сталася ад таго далёкага ціўкання куль, а танкавыя стрэлы агаломшылі і мяне. І падумалася: вось яна, гісторыя -- жывая, са сваімі фарбамі, пахамі і адчуваннямі...

Але ж толькі сведкаў таго незабыўнага мінулага, на вялікі жаль, з кожным днём ўсё меней і меней...

Мікола ЯЦКОЎ.

"БРЫЛЁЎСКІ ЛЕТАПІС"
Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь в.Брылі Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці, Рэспубліка Беларусь.
Заснавальнік - М.А.Яцкоў

Адказны за выпуск - Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі, вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: bryli@mail.ru

Матэрыялы друкуюцца на мове аўтараў. Звярстана і надрукавана на ўласным абсталяванні.
Наклад 99 асобнікаў.
Распаўсюджваецца бясплатна.
© "Брылёўскі летапіс", 2009